**З 26.03.2018 па 30.03.2018** дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» праводзіла **павышэння кваліфікацыі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, педагагічных работнікаў, якія з'яўляюцца кіраўнікамі метадычных фарміраванняў** «РЭАЛІЗАЦЫЯ ЗМЕСТУ І СУЧАСНЫХ МЕТАДЫЧНЫХ ПАДЫХОДАЎ У ВЫКЛАДАННІ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА НА БАЗАВЫМ І ПАВЫШАНЫМ УЗРОЎНЯХ». Метадыст цэнтра развіццёвых педагагічных тэхналогій Пашковіч Т.Ф. пазнаёміла слухачоў з сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіям і эфектыўнымі формамі, метадамі, прыёмамі навучання на базавым і павышаным ўзроўнях вывучэння прадмета. Таксама Т.Ф. Пашковіч і дацэнт кафедры сучасных методык і тэхналогій адукацыі, кандыдат педагагічных навук Слесарава І.М. правялі вучэбную дзелавую гульню, прысвечаную арганізацыі даследчай дзейнасці па беларускай мове і літаратуры ў структуры профільнага навучання. Начальнік цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі Радзевіч А.У. прысвяціла сваю лекцыю праблемам медыяадукацыі. Метадыст упраўлення вучэбна-метадычнай работы Акушэвіч А.А. правёў для слухачоў заняткі па фарміраванні і развіцці чытацкай пісьменнасці вучняў, а таксама па выкарыстанні здабыткаў сучаснага літаратуразнаўства ў даследаванні беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў пры вывучэнні зместу вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» на базавым і павышаным узроўнях. Падчас круглага стала было абмеркавана нарматыўнае прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» на базавым і павышаным узроўнях. Настаўнікі беларускай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» Зяневіч А.М. (ДУА «Сярэдняя школа № 43 г. Мінска»), Казачэнка І.Р. (ДУА «Лельчыцкая раённая гімназія»), Казлова А.У. (УА «Полацкая дзяржаўная гімназія №1 імя Францыска Скарыны») і Сілюк Н.У. (ДУА «Вучэбна-педагагічны комплекс Юрацішкаўскі яслі-сад-сярэдняя школа» Іўеўскага раёна) падзяліліся эфектыўным вопытам навучання беларускай мове і літаратуры ва ўмовах профільнага навучання. Сярод іншага настаўнікі прадставілі свае ЭАР: «Вэб-квесты па беларускай літаратуры» (Казачэнка І.Р., https://questlit.jimdo.com), «Размова» (Сілюк Н.У., http://razmowa.blogspot.com.by), «ЛІТАРАтУРА.BY» (Сілюк Н.У., https://sites.google.com/site/litaraturaby/).

Павышэнне кваліфікацыі «Рэалізацыя зместу і сучасных метадычных падыходаў у выкладанні вучэбнага прадмета на базавым і павышаным узроўнях» выклікала вялікую цікавасць з боку слухачоў, якія падчас падвядзення вынікаў прапанавалі паўтарыць дадзенае метадычнае мерапрыемства для іх калег.